# Сацыяльна-адукацыйная акцыя “Жанкілі” 2025

Далучайцеся да сацыяльна-адукацыйнай акцыі “Жанкілі”, прысвечанай гадавіне паўстання ў Варшаўскім гета. 19 красавіка заахвочваем прымацаваць жоўтыя нарцысы ў знак таго, што # НасЯднаеПамяць пра паўстанцаў і мірных жыхароў, якія хаваліся ў руінах гета.

- Фільмы пра акцыю “Жанкілі” з субтытрамі на беларускай мове →

Акцыю “Жанкілі” падтрымліваюць новыя амбасадары і амбасадаркі: Роберт Макловіч, актрыса Барбара Выпых, група “Kwiat Jabłoni” з Касяй і Яцэкам Сянкевіч, псіхолаг Эва Вайдыдла-Асятыньска, а таксама нашыя цудоўныя валанцёры – Марыя, Луіза і Міраслаў.

У 82 гадавіну красавіцкага паўстання мы прысвяцілі праграму акцыі адвазе і розным яе абліччам: адвазе штодзённай, якая дапамагае трымацца ў жыцці, і той, якая патрэбная ў барацьбе, нават калі няма шанцаў на выратаванне.

“Мужнасць – гэта, перш за ўсё, вернасць сабе, сваім перакананням. Бываюць часы, калі вернасць сабе патрабуе велізарных, часам проста неверагодных ахвяраў. Менавіта так было тут, у Варшаве, 19 красавіка 1943 года, калі выбухнула паўтанне ў Варшаўскім гета” – кажа Роберт Макловіч, амбасадар акцыі “Жанілі” ў гэтым годзе.

Паўстанне і вайну перажыло вельмі-вельмі мала яўрэйскіх жанчын і яўрэяў. Сярод іх быў апошні лідэр паўстання, Марк Эдэльман. Менавіта ад яго асабістай традыцыі – ускладання жоўтых нарцысаў да помніка Героям Варшаўскага гета – паўстаў сімвал акцыі. Мы працягваем гэтую традыцыю, калі раздаём тысячы папяровых нарцысаў у кожную гадавіну паўстання.

**19 красавіка:**

- прышпілі жанкіль (жоўты нарцыс) у знак таго, што #НасЯднаеПамяць,
- прыходзь у Музей POLIN з жанкілем, каб бясплатна пабачыць выставы, заплануй наведванне →
- апублікуй фотаздымак ці малюнак з жоўтым нарцысам у сацыяльных сетках з хэштэгамі #НасЯднаеПамяць і #AkcjaŻonkile,
- вазьмі ўдзел ва ўрачыстасцях пад помнікам Героям Варшаўскага гета ў раёне Муранаў.

**Як прыняць удзел у акцыі "Жанкілі"? / Дзе ўзяць жанкіль? →**

- **19 красавіка валанцёры будуць раздаваць папяровыя жоўтыя нарцысы.** Вы іх сустрэнеце амаль ва ўсёй Варшаве.
- **Камплекты налепак у выглядзе жанкіляў знойдзеце ў выданнях:** "VIVA!" (10 красавіка), "Gazeta Telewizyjna" (11 красавіка), "Newsweek" (14 красавіка), "Tygodnik Powszechny" (16 красавіка).
- **Як самастойна зрабіць жоўты нарцыс?** Будзе дастаткова, калі вы спампуеце шаблон з нашага сайта, раздрукуеце яго і збераце (тут вам дапаможа відэаінструкцыя).
- Таксама мы падрыхтавалі спрошчаны **шаблон нарцыса**, якім можна карыстацца, каб самастойна зрабіць кветку. Раім выкарыстаць спрошчаны шаблон дзецям малодшага школьнага ўзросту, а таксама людзям з маторнымі парушэннямі.
спрошчаны шаблон нарцыса →
- Таксама заахвочваем вас публікаваць фотаздымкі нарцысаў і налепак ў сацыяльных сетках. Не забудзьцеся пра хэштэгі: **#НасЯднаеПамяць** і **#AkcjaŻonkile**, а таксама **адзначайце профіль музея @polinmuseum**.
- **Таксама можаце падзяліцца спецыяльнай графікай** у такіх сацыяльных сетках, як Facebook, Instagram і TikTok. Памятайце пра хэштэгі: **#НасЯднаеПамяць**, **#AkcjaŻonkile, # polinmuseum**.